ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ
І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

| № 10 (570) | Субота, 31 сакавіка 1984 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап |
|---|---|---|---|

Заўтра — Дзень геолага

# ГЕАГРАФІЯ МУЖНАСЦІ

На эмблеме Міжнароднага саюза геолагаў напісаны словы: «Малатком і розумам». Усё правільна. Без малатка, рыдлёўкі, кайла не абысціся і сучаснаму геолагу. Неабходна адбіраць узоры горных парод з агаленняў, праходзіць шурфы, напрыклад, у працэсе пошукаў месцанараджэнняў рассыпнога золата. Але ўсё ж такі рашаючую ролю адыгрывае тэхніка — сучасныя буравыя станкі, геафізічная апаратура, цегачы, верталёты, спадарожнікі. Звышглыбокая свідравіна мае глыбіню звыш 12000 м, а бур працягвае крышыць мацнейшыя і старажытныя горныя пароды Зямлі! З дапамогай геафізічнай апаратуры мы даведаліся аб будове планеты Зямля да яе ядра. Прычым, аб гэтым ведаюць не толькі спецыялісты, але і шырокія колы насельніцтва. Значыць, галоўным у прафесіі геолага з'яўляецца не малаток, а розум даследчыка зямных нетраў. Праўда, ніхто яшчэ не бачыў узораў парод са знешняга, а тым больш з унутранага ядра Зямлі, але мы ўжо ведаем іх шчыльнасць! Яна вельмі высокая, падобная на шчыльнасць металаў. Падрабязна вывучыць яе змогуць будучыя пакаленні геолагаў. Яны апраўдаюць словы, прыведзеныя ў пачатку артыкула. З дапамогай тэхнікі і розуму ўжо ў бліжэйшыя гады будуць дасягнуты такія поспехі, аб якіх цяпер нават цяжка ўявіць.

Вялікай увагі заслугоўваюць даследаванні, якія праводзяцца з дапамогай касмічных апаратаў. Яны даюць надзвычайныя вынікі! Зямля ўдоўж і ўпоперак абходжана геолагамі. Нездарма сярод іх часта можна пачуць выраз: «Ісціна спазнаецца нагамі». Але аказваецца, што многія геалагічныя аб'екты бачныя не толькі зблізу, але і з адлегласці 300—400 кіламетраў. І такія геалагічныя структуры, раней невядомыя або слаба вывучаныя, адкрыты нашымі слаўнымі касманаўтамі. Чорна-белыя і каляровыя фотаздымкі з касмічных караблёў як-бы прасвечваюць Зямлю на пэўную глыбіню. З іх дапамогай удакладняецца геалагічная будова, глыбіня залягання прэсных і салёных мінеральных вод.

Наша краіна забяспечана ўсімі карыснымі выкапнямі. У гэтым вялікая заслуга геолагаў усіх узростаў — і цяперашніх пенсіянераў, якія ўспамінаюць былыя паходы, і маладых спецыялістаў, якія адразу пасля ВНУ ўключыліся ў рашэнне народнагаспадарчых задач.

У нетрах Беларусі і Гомельскай вобласці таксама адкрыты карысныя выкапні. У Гомелі, напрыклад, шырока выкарыстоўваюцца падземныя воды для гаспадарча-піццявога водазабеспячэння, мінеральныя лячэбныя воды, прыродныя будаўнічыя матэрыялы. Хто ў нашай краіне не ведае славутае Салігорскае месцанараджэнне калійных солей? З нетраў Прыпяцкай упадзіны цячэ па трубах нафта.

Гомельскі дзяржаўны універсітэт з'яўляецца кузняй геалагічных кадраў Беларусі. Геалагічны факультэт падрыхтаваў сотні інжынераў-гідрагеолагаў, якія вядуць паспяховую разведку месцанараджэнняў прэсных падземных вод для водазабеспячэння, мінеральных лячэбных вод, вывучаюць грунты, на якіх узводзяцца фундаменты сучасных інжынерных аб'ектаў — заводаў, электрастанцый, жылых дамоў. Здавалася б, спецыяльнасць «гідрагеалогія і інжынерная геалогія» — вузкая. Але гэта не так. Нашы выхаванцы могуць працаваць геолагамі-здымшчыкамі, нафтавікамі, геафізікамі. У любым адміністрацыйным цэнтры рэспублікі можна сустрэць выпускніка геалагічнага факультэта ГДУ. Многія з іх працуюць у геалагічных арганізацыях Гомеля — аб'яднанні «Беларусьнафта», Інстытуце УкргіпраНДІнафта, трэсце «Белнафтагазразведка» гідрагеолага-меліярацыйнай партыі Палескай экспедыцыі і інш. У адной толькі гідрагеолага-меліярацыйнай партыі працуе 6 выпускнікоў геалагічнага факультэта ГДУ — В. Шаўцоў. В. Ермакоў, А. Кавалёў, В. Ляляўскі, П. Давыдзенка, А. Шаўцова — увесь яе кіруючы састаў! Партыя ацэньвае эфектыўнасць работы меліярацыйных сістэм у Гомельскай вобласці і дае рэкамендацыі па іх паляпшэнню і рэканструкцыі ў Гомельскім, Добрушскім, Буда-Кашалёўскім, Ельскім і Брагінскім раёнах, бурыць свідравіны, праводзіць з іх адкачку і складае неабходныя сельскагаспадарчым арганізацыям гідрагеолага-меліярацыйныя карты. У мінулым годзе яна аказала вялікую дапамогу геалагічнаму факультэту ў стварэнні вучэбнага палігона для правядзення практык студэнтаў у Чонках. Гідрагеолага-меліярацыйная партыя накіравала на вучобу ва універсітэт лепшага бурыльшчыка камуніста Г. Кіслюка, які хутка стаў лепшым і ў вучобе.

Мы не маем магчымасці расказаць падабязна аб усіх нашых выпускніках, з якімі мы вядзем перапіску, падтрымліваем сувязі. Яны працуюць не толькі ў Беларусі, але ў Заходняй і Усходняй Сібіры, на Чукотцы, Сахаліне, Камчатцы. Інжынер Самусенка, напрыклад, выдатна зарэкамендаваў сябе ў Хабараўскім геалагічным упраўленні. Інжынеры Котаў і Лапашына з захапленнем вядуць разведку аднаго з месцанараджэнняў на Падкаменнай Тунгусцы. Муж і жонка Федзіны забраліся на Крайнюю Поўнач. Гідрагеалагічныя партыі Паволжжа таксама ўкамплектаваны выпускнікамі Гомельскага універсітэта. Усяму свету вядомы нафтавыя і газавыя месцанараджэнні Заходняй Сібіры, адкуль бяруць пачатак гіганцкія газаправоды. А там, у суровых кліматычных умовах выконвае геалагічныя заданні пяцігодкі цэлая плеяда выпускнікоў геалагічнага факультэта ГДУ. Шырокая геаграфія мужнасці!

**М. ЖУРАВЕЛЬ,**
**загадчык кафедры інжынернай геалогіі і гідрагеалогіі, дацэнт.**

# АГУЛЬНАУНІВЕРСІТЭЦКІ ПАРТЫЙНЫ СХОД

23 сакавіка ў актавай зале адбыўся агульнауніверсітэцкі партыйны сход. З дакладам «Вынікі нечарговага лютаўскага (1984 г.) Пленума ЦК КПСС і задачы партыйнай арганізацыі Гомельскага дзяржуніверсітэта, вынікаючыя з палажэнняў і вывадаў, якія ўтрымліваюцца ў прамове Генеральнага сакратара ЦК КПСС таварыша К. У. Чарненкі», выступіў намеснік сакратара парткома па ідэалагічнай рабоце **Г. Д. Ветлугаеў.**

У абмеркаванні даклада прынялі ўдзел партгрупорг інфармацыйна-вылічальнага цэнтра **А. Д. Ложкін**, намеснік сакратара партбюро гісторыка-філалагічнага факультэта **Г. С. Еўдакіменка**, прарэктар па вучэбнай рабоце **Л. А. Шамяткоў,** загадчык кафедры фізікі цвёрдага цела **В. А. Балакін**, намеснік сакратара камітэта камсамола па арганізацыйнай рабоце **А. А. Шалдукова,** член партбюро эканамічнага факультэта **Г. К. Котаў,** сакратар партбюро АГЧ **М. П. Шкарбун.**

Дакладчык і выступіўшыя камуністы асноўную ўвагу сканцэнтравалі на пытаннях далейшага ўдасканальвання ўсёй партыйнай работы, умацавання працоўнай, вучэбнай і выканаўчай дысцыпліны, павышэння якасці падрыхтоўкі маладых спецыялістаў, пашырэння і паглыблення навуковых даследаванняў і забеспячэння няўхільнага росту эфектыўнасці ад іх укаранення ў вытворчасць.

На сходзе гаварылася аб магчымасцях і рэзервах, поўнае выкарыстанне якіх дазволіць універсітэту займаць у сацыялістычным спаборніцтве сярод ВНУ рэспублікі перадавыя пазіцыі. Указвалася і на недахопы, якія мелі месца ў рабоце некаторых пярвічных партарганізацый структурных падраздзяленняў універсітэта.

На партыйным сходзе па абмеркаванаму пытанню прынята адпаведная пастанова.

ПАЗЫЎНЫЯ «ЧЫРВОНАЙ СУБОТЫ»

# БЯРЭ СТАРТ СВЯТА ПРАЦЫ

У нашым універсітэце, як і ва ўсіх калектывах краіны, актыўна рыхтуюцца да Усесаюзнага камуністычнага суботніка, прысвечанага 114-ай гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна. На пасяджэнні партыйнага камітэта ГДУ зацверджаны штаб па правядзенню свята працы. Яго ўзначаліў прарэктар па АГЧ У. А. Шаўчэнка. Ужо распрацаваны графік удзелу студэнтаў і супрацоўнікаў у выкананні вызначанага аб'ёму работ. Многае прадстаіць зрабіць па добраўпарадкаванню вучэбных карпусоў і інтэрнатаў універсітэта, прылягаючых да іх тэрыторый, вуліц і паркаў нашага горада, на будуемым універмагу.

Першыя групы студэнтаў пачнуць працаваць у лік ленінскага суботніка з наступнага тыдня.

# НА САВЕЦЕ УНІВЕРСІТЭТА

22-га сакавіка адбылося чарговае пасяджэнне Савета універсітэта. З навуковым дакладам «У. І. Ленін і станаўленне геалагічных даследаванняў у СССР» выступіў прафесар кафедры мінералогіі і агульнай геалогіі Г. А. Кузняцоў.

Аб рабоце факультэта прафарыентацыі і стажыроўцы маладых спецыялістаў расказаў на Савеце яго дэкан В. І. Селіванаў.

Аб арганізацыі практык студэнтаў у 1983/84 навучальным годзе гаварыла на Савеце Ю. Д. Алейнік.

Загадчык кафедры оптыкі А. М. Сердзюкоў далажыў Савету аб рабоце ўзначальваемай ім кафедры па актывізацыі пазнавальнай дзейнасці студэнтаў у працэсе навучання. Дэкан фізічнага факультэта У. М. Стрыкаў праінфармаваў, як выконваецца пастанова Савета універсітэта ад 18 мая 1983 года аб стварэнні на факультэце вучэбна-метадычнага комплексу.

Начальнік аддзела кадраў П. А. Савінскі выступіў з паведамленнем аб выніках размеркавання і яўкі выпускнікоў 1982-83 навучальнага года на працу.

На вакантныя і займаемыя пасады выбраны і перавыбраны прафесарска-выкладчыцкі састаў.

Ва ўрачыстай абстаноўцы прарэктар па навуковай рабоце, член-карэспандэнт АН БССР Л. А. Шамяткоў уручыў медалі «Ветэран працы» дацэнту кафедры беларускай мовы Д. А. Лявончанку, выкладчыцы кафедры нямецкай і французскай моў Т. С. Капароўскай, прыбіральшчыцам студэнцкага інтэрната № 3 і вучэбнага корпуса № 4 М. І. Самадуравай і В. І. Жыгалкінай, якіх яны ўдастоены за шматгадовую і сумленную працу ў нашай ВНУ.



НА ЗДЫМКУ: выпускнікі геалагічнага факультэта, цяперашнія супрацоўнікі гідрагеолага-меліярацыйнай партыі Палескай экспедыцыі В. Шаўцоў, В. Ляляўскі, П. Давыдзенка разам з дацэнтам геалагічнага факультэта Ж. Герасімавай і асістэнтам Ю. Івановым абмяркоўваюць перспектывы сумесных навуковых даследаванняў.

# ДЗЕНЬ АДКРЫТЫХ ДЗВЯРЭЙ

Штогод у перыяд веснавых канікул у нашым універсітэце праводзіцца «Дзень адкрытых дзвярэй». Сёлета ён адбыўся 26-га сакавіка. У вядучую вышэйшую навучальную ўстанову Беларускага Палесся прыйшлі дзесяцікласнікі з Гомеля і школ суседніх раёнаў. Іх ветліва сустрэлі ў актавай зале. Перад прысутнымі выступіў прарэктар па вучэбнай рабоце, член-карэспандэнт АН БССР Л. А. Шамяткоў. Леанід Аляксандравіч расказаў аб станаўленні і развіцці універсітэта, яго спецыяльнасцях і спецыялізацыях. Будучых абітурыентаў пазнаёмілі з дэканамі факультэтаў. Разам з імі жадаючыя вучыцца ў ГДУ наведалі выбраныя факультэты, дзе больш шырока даведаліся аб прафесіі, якую мараць набыць, атрымалі адказы на хвалюючыя пытанні.

(Наш кар.).

# ВІНШУЕМ!

**Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат эканамічнага факультэта, кафедра галіновых эканомік горача віншуюць асістэнта гэтай кафедры КАРПЕЙ Тамару Васільеўну (навуковы кіраўнік — прафесар С. А. Кім) з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата тэхнічных навук.**

* * *

**Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат геалагічнага факультэта, кафедра інжынернай геалогіі і гідрагеалогіі горача віншуюць асістэнта гэтай кафедры ІВАНОВА Юрыя Паўлавіча з выпадку зацвярджэння яго ВАКам у вучонай ступені кандыдата геолага-мінералагічных навук.**

НАСУСТРАЧ 40-ГОДДЗЮ ВЫЗВАЛЕННЯ БЕЛАРУСІ

## ЗА ГАНАРОВАЕ ПРАВА

Ва універсітэце шырыцца сацыялістычнае спаборніцтва камсамольцаў за права быць сфатаграфаванымі ля разгорнутага Чырвонага сцяга раённай камсамольскай арганізацыі ў гонар 40-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Актыўна ўключыліся ў спаборніцтва і студэнты эканамічнага факультэта. Актывізавалася грамадская дзейнасць камсамольцаў, яны імкнуцца павышаць узровень паспяховасці, актыўна рыхтуюцца да чарговага працоўнага семестра-84.

На адным з паверхаў факультэта афармлены спецыяльны стэнд з экранам ходу спаборніцтва, на які занесены прозвішчы студэнтаў —пераможцаў першага і другога этапаў спаборніцтва. Імі сталі Л. Шаўцова — першакурсніца аддзялення эканомікі працы, Л. Кароткая (0-22), Л. Бурава (Т-31), В. Васюк (Т-44), А. Лішык (Т-13), А. Паташэнка (0-42).

Жадаем усім камсамольцам далейшых поспехаў у сацыялістычным спаборніцтве.

**І. НЕШЫК,**
**старшыня прэс-цэнтра эканамічнага факультэта.**

*На традыцыйных днях*

# ЦІКАВЫ НАРОД — МАТЭМАТЫКІ

**Заўсёды цікава, насычана праходзяць на матэматычным факультэце традыцыйныя дні кафедр, ініцыятарам якіх яшчэ ў пачатку 70-х гадоў стала кафедра алгебры і геаметрыі. Вось і ў бягучым навучальным годзе ўжо прайшлі дні кафедр матэматычнага аналізу, тэорыі функцый і функцыянальнага аналізу. Нядаўна на працягу двух тыдняў свае мерапрыемствы са студэнтамі, якія жывуць у інтэрнаце № 2, праводзіў калектыў кафедры алгебры і геаметрыі.**



Традыцыйныя дні пачаліся лекцыяй «Матэматыка ў музыцы», з якой выступіў перад студэнтамі загадчык кафедры алгебры і геаметрыі, прарэктар па вучэбнай рабоце, член-карэспандэнт АН БССР, прафесар Л. А. Шамяткоў (на здымку). У захапляючай форме Леанід Аляксандравіч расказаў аб асаблівасцях будовы музычнай гамы, аб гісторыі развіцця музыкі і музычных інструментаў, прынцыпах канструявання сучасных музычных інструментаў, якія засноўваюцца на глыбокім веданні матэматычных асноў і фізічнай прыроды гуку. Л. А. Шамяткоў выканаў на фартэпіяна некалькі музычных экспромтаў.

У рамках дзён кафедры прайшоў і вечар савецкай паэзіі, які вёў сакратар партбюро факультэта, дацэнт Л. Я. Палякоў. У яго выкананні пранікнёна гучалі вершы Канстанціна Сіманава. Шмат аматараў паэтычнага радка ёсць сярод будучых матэматыкаў. Свае любімыя паэтычныя творы чыталі Антаніна Арэшачка, Сяргей Савенка, Люда Пашкоўская, Лена Раманоўская, Жана Хатылёва, Таццяна Каліберава. Але які студэнцкі, ды яшчэ такі задушэўны, вечар абыдзецца без гітары? Песні на вершы Б. Акуджавы выконвалі дзве Ірыны — Марчанка і Сянцюрава, а таксама Марына Малыш. Гэты вечар сабраў вялікую аўдыторыю — хол другога паверха быў запоўнены да адказу.

На трэці дзень у праграму сустрэчы ўсяго калектыву кафедры са студэнтамі ўваходзіла: «Гомельская алгебра. Што гэта такое?» Загадчык кафедры Л. А. Шамяткоў расказаў аб створанай акадэмікам АН БССР С. А. Чуніхіным гомельскай алгебраічнай школе. Для студэнтаў гэты расказ быў цікавым яшчэ і таму, што развіццё алгебраічных даследаванняў у Гомелі цесна звязана з імем легендарнага савецкага вучонага, акадэміка, Героя Савецкага Саюза, матэматыка і палярніка О. Ю. Шмідта, адным з першых вучняў якога і быў С. А. Чуніхін. На кафедры працуюць яго вучні Л. А. Шамяткоў, Л. Я. Палякоў, В. Д. Чарток, а ў Леаніда Аляксандравіча шмат сваіх вучняў: М. В. Селькін, У. М. Семянчук, С. Ф. Каморнікаў, А. Д. Хадалевіч... Цапная рэакцыя ведаў і навуковага пошуку нестрымальная!

Студэнтам у папулярнай форме расказвалася аб навуковых дасягненнях кафедры, былі паказаны зборнікі прац, якія выдадзены сумесна з гомельскім аддзяленнем Інстытута матэматыкі АН БССР.

Пасля выступлення Л. А. Шамяткова дэманстраваўся аматарскі кінафільм аб Усесаюзнай алгебраічнай канферэнцыі ў г. Гомелі 1978 года. З цікавасцю глядзелі студэнты на зусім маладых у той час сваіх выкладчыкаў, бачылі іх энергію, захопленасць сваёй справай, вялікае жаданне працаваць, праводзіць навуковыя даследаванні.Каменціруючы фільм, Леанід Аляксандравіч расказаў пра вядучых савецкіх алгебраістаў, з якімі кафедра пастаянна падтрымлівае творчыя навуковыя сувязі, аб іх жыццёвым шляху пасля канферэнцыі і аб выніках іх даследаванняў.

Пасля прагляду фільма адбылася прэс-канферэнцыя. Л. А. Шамяткоў і іншыя члены кафедры алгебры і геаметрыі адказалі на пытанні прысутных. Шмат цікавага расказаў Леанід Аляксандравіч аб сваім камсамольскім юнацтве, гадах вучобы ў ВНУ. Мала хто ведае, што ў свае студэнцкія гады ён займаўся не толькі навукай, але і актыўна ўдзельнічаў у мастацкай самадзейнасці — іграў на акардэоне і фартэпіяна. Ён жа быў удзельнікам першага ў нашай ВНУ лыжнага агітацыйна-масавага паходу па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы.

18-га сакавіка праходзілі спартыўныя спаборніцтвы. Спачатку аб баскетболе. Каманды кафедры і інтэрната вывеў на пляцоўку суддзя рэспубліканскай катэгорыі Л. Я. Палякоў. З першых мінут сустрэчы студэнты зразумелі, што ў асобе сваіх старэйшых таварышаў не толькі на заліках і экзаменах, але і тут яны сустрэлі сур'ёзных сапернікаў. Вялікі вопыт і тэхніку прадэманстравалі У. М. Семянчук і М. В. Селькін. У барацьбе за верхавыя мячы яны часта выходзілі пераможцамі над «асамі» факультэцкага баскетбола. Ветэраны заслужана перамаглі — 31:30. Праўда, у другой палове сустрэчы не ўдзельнічаў у гульні за каманду студэнтаў член каманды майстроў «Сож» Віктар Шведаў. Затое ўсю сустрэчу падтрмліваў алгебраістаў дацэнт кафедры тэорыі функцый і функцыянальнага аналізу В. Р. Ермакоў.

У валейбольнай сустрэчы перавага кафедральнай каманды была яшчэ больш адчувальнай. Ніхто не мог узяць мяч пасля завяршальнага ўдара аспіранта Яўгена Таргонскага.

Дваццатага сакавіка свой творчы вечар праводзіла група М-41. Яе студэнты праходзяць спецыялізацыю па кафедры алгебры і геаметрыі. Вечар, які прысвячаўся матэматыцы, быў падрыхтаваны пад кіраўніцтвам куратара, дацэнта В. Д. Чартка. У выступленнях Алены Махновай і Ноны Джыоевай прагучалі расказы аб вялікіх матэматыках. Ажыўлена і захапляльна прайшла матэматычная віктарына. Сапраўдным сюрпрызам з'явілася тэатралізаваная пастаноўка чэхаўскай інтэрмедыі «Рэпетытар». Яе на прафесіянальным ўзроўні выканалі Аляксандр Шацько, Алег Еўстраценка і Сяргей Новікаў. Карыснасць гэтага вечара адметна яшчэ і тым, што многія нашы студэнты — будучыя настаўнікі. І дзе ж, як не ў сценах універсітэта, ім трэба спазнаць розныя формы правядзення выхаваўчых мерапрыемстваў.

Дзень апошні — сёмы. Экскурсія на кафедру ў ствараемы кафедральны музей. Гэта свайго роду ўнікальны збор фотаздымкаў, фотапартрэтаў, якія адлюстроўваюць гісторыю алгебры. У гэтым кафедральным пакоі ўсё «дыхае» навукай — і навуковыя працы, і твары карыфеяў алгебры, і, нарэшце, жывы расказ загадчыка кафедры, які сам быў удзельнікам многіх цікавых усесаюзных і міжнародных форумаў.

..Дні кафедры алгебры і геаметрыі. Не, гэта былі не проста дні. Гэта быў цэлы комплекс добра падрыхтаваных разнастайных па зместу, нестандартных мерапрыемстваў. І нават слова «мерапрыемства» сюды не зусім падыходзіць. Гэта былі проста чалавечыя і творчыя ўзаемаадносіны розных па ўзросту, але адзіных у сваім імкненні да культуры і навуковых ведаў людзей.

**А. ВАСІЛЬЕЎ,**
**асістэнт кафедры алгебры і геаметрыі.**

## НАСЦЕННАМУ ДРУКУ — ПАДРЫХТАВАНЫХ АЎТАРАЎ

На гэтым тыдні ў панядзелак адбылося пасяджэнне Савета факультэта грамадскіх прафесій. На яго былі запрошаны намеснікі сакратароў партбюро па ідэалагічнай рабоце, члены камсамольскіх бюро, рэдактары факультэцкіх насценных газет. Абмеркавана пытанне аб стане насценнага друку ва універсітэце і мерах па яго паляпшэнню. З інфармацыяй выступіў адказны за насценны друк ад партыйнага камітэта, рэдактар шматтыражнай газеты «Гомельскі універсітэт» Ул. Балога. Ён гаварыў і аб рабоце аддзялення журналістыкі факультэта грамадскіх прафесій, на якім павінны набываць патрэбныя навыкі і члены рэдкалегій насценных газет. Аднак гэтай формай творчай вучобы ахоплены яшчэ не многія студэнты. Значная колькасць слухачоў аддзялення журналістыкі ўхіляецца ад наведвання заняткаў. Саветам ФГП вызначаны меры па актывізацыі работы аддзялення журналістыкі.

На пасяджэнні Савета ішла размова і аб паляпшэнні дзейнасці работы аддзялення метадыстаў-арганізатараў па ахове прыроды і метадыстаў-арганізатараў аддзялення камсамольскай работы.

## ЗЛЁТ ДРУЖЫННІКАЎ

23 сакавіка адбыўся злёт дружыннікаў Цэнтральнага раёна г. Гомеля, прысвечаны 25-годдзю стварэння ў краіне першых грамадскіх фарміраванняў па ахове правапарадку. Са справаздачным дакладам на злёце выступіў начальнік штаба ДНД раёна, намеснік старшыні райвыканкома В. П. Шчаглоў. Работнікі міліцыі расказалі аб аператыўнай абстаноўцы ў раёне. Затым вопытам работы падзяліліся камандзіры ДНД і дружыннікі прадпрыемстваў і арганізацый раёна.

Дэлегаты злёту прынялі зварот да ўсіх дружыннікаў горада па падтрыманню ўзорнага грамадскага парадку. Лепшыя дружыннікі раёна, у тым ліку і ГДУ, атрымалі ўзнагароды. Знака ЦК ВЛКСМ «За актыўную работу па ахове грамадскага парадку» удастоены студэнты Мікалай Шпакоўскі з эканамічнага і Міхаіл Марчанка з матэматычнага факультэтаў. Ганаровай граматай РАУС узнагароджаны старшы навуковы супрацоўнік кафедры оптыкі Г. Пакаташкін, Ганаровай граматай АК ЛКСМБ — студэнт эканомфака Алег Чубенка і інш.

**В. ТРУХАЎ,**
**кіраўнік ДНД ГДУ, дацэнт кафедры АМАЭІ.**

*Мы — інтэрнацыяналісты*

## ФОРМЫ РАБОТЫ — РАЗНАСТАЙНЫЯ

Фестываль — гэта заўсёды сапраўднае свята для тых, хто запрошан на яго, каму пашчасціла прадстаўляць свой Клуб інтэрнацыянальнай дружбы на гэтым савеце моладзі і студэнтаў.

На фестывалях у Чарнаўцах, Цярнопалі, Херсоне, Сумах, Казані, Бранску, Яраслаўлі пабывалі члены нашага універсітэцкага КІДа, «Саюз». Вяртаючыся з гэтых незабыўных свят студэнтаў, мы прывозім з сабой шмат новых адрасоў сяброў.

Перапіска — адна з самых распаўсюджаных форм работы Клубаў інтэрнацыянальнай дружбы. Мы даведваемся аб самых цікавых мерапрыемствах, якія праводзяцца ў КІДах нашых сяброў.

Члены КІДа Казанскага дзяржаўнага універсітэта прапанавалі нам прыняць удзел у зборы значкоў для камуністычных арганізацый капіталістычных краін.Студэнты ГДУ падтрымалі ініцыятыву казанскіх сяброў. Сабрана 240 значкоў з сілуэтам У. І. Леніна і адпраўлена бандэроль у Казань. Збор значкоў на факультэтах ГДУ працягваецца.

Сектар савецка-чэхаславацкай дружбы арганізаваны ў нашым КІДзе «Саюз» толькі ў гэтым годзе, але адразу прыцягнуў павышаную ўвагу да сябе новых членаў клуба. Гэта ж вельмі цікава даведацца як мага больш аб братняй краіне, яе людзях, звычаях, гісторыі! Ужо праведзен вечар, прысвечаны Сацыялістычнаму Саюзу Моладзі Чэхаславакіі.

Цікавая работа прадстаіць культурна-масаваму сектару КІДа. Кідаўцы пазнаёмяцца з адным з самых папулярных жанраў сучаснай песні — палітычнай песняй.

Сектар нагляднай агітацыі і інфармацыі КІДа запрашае прыняць удзел у конкурсе гумарыстычных плакатаў-рэклам факультэтаў. Вынікі конкурсу будуць падведзены ў бліжэйшыя дні.

**Алена КЕБЕЦ,**
**член КІДа «Саюз».**

# НОВЫ РАДОК ДА ТРАДЫЦЫЙ

Нямногім больш чатырох месяцаў таму назад у нашым універсітэце гасцінна расчыніліся дзверы з густам афармленага студэнцкага кафэ. Гэтая падзея прысвячалася тады 40-годдзю вызвалення Гомеля ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Ганаровае права быць першымі гаспадарамі ўтульнага месца для адпачынку было прадастаўлена лепшай акадэмічнай групе Г-41 гісторыка-філалагічнага факультэта і тым, хто сваімі ўмелымі рукамі па-майстэрску афармляў кафэ. І вось зноў тут сабраліся будучыя філолагі і гісторыкі. На гэты раз — выдатнікі вучобы. Іх на гістфіле цяпер нямала — 65. На сустрэчу ж выдатнікаў, якая адбылася 23 сакавіка, былі запрошаны толькі тыя, хто мае адны выдатныя адзнакі ў сваіх залікоўках за апошнія тры семестры.

На сустрэчы прысутнічалі кіраўнікі і загадчыкі кафедр факультэта, запрошаныя госці. Выдатнікі падрыхтавалі цікавую кампазіцыю, якая перамяжоўвалася ўзнёслымі словамі вядучай, выступленнямі заслужаных прадстаўнікоў старэйшага пакалення і музычнымі прывітаннямі ў іх адрас. Як лепшы напамінак аб гэтым вечары ім жа былі ўручаны кнігі.

Першым на сустрэчы выступіў ветэран Узброеных Сіл СССР маёр запасу, старшыня камітэта ДТСААФ У. А. Коўш. Ён гаварыў аб бяспрыкладных мужнасці і гераізме савецкіх воінаў, якія, не шкадуючы свайго жыцця, заваявалі сённяшні шчаслівы дзень, калі пад мірным небам юнакі і дзяўчаты маюць магчымасць для выдатнай вучобы, ажыццяўлення ўсіх сваіх самых запаветных мар, культурнага адпачынку. Выступленне Уладзіміра Антонавіча непасрэдным чынам было звязана з падрыхтоўкай беларускага народа да знамянальнай даты — 40-годдзя вызвалення рэспублікі ад гітлераўскіх акупантаў.

Пасля задушэўнай песні слова было прадастаўлена загадчыку кафедры рускай літаратуры дацэнту У. М. Сабаленку. Уладзімір Міхалаевіч нагадаў сваю студэнцкую пару і 1956 год, калі яму пашчасціла ўдзельнічаць у асваенні цалінных земляў. І ўслед з яго ўспамінамі пераклікнуліся словы дэкана факультэта тэатральнага мастацтва народнага універсітэта маральна-эстэтычнага выхавання ГДУ заслужанай артысткі БССР Н. А. Карнеевай. Якраз у той год Ніна Аляксееўна, тады яшчэ маладая актрыса, у саставе сваёй тэатральнай трупы выступала на казахстанскай зямлі са спектаклямі. Сваё высокае прафесіянальнае майстэрства яна пацвердзіла і на сустрэчы з выдатнікамі, дзе чытала гумарыстычныя мініяцюры.

Кранаючымі да глыбіні сэрца, выключна хвалюючымі былі выступленні былой выпускніцы нашай ВНУ, чалавека дзіўнага гераічнага лёсу Л. Ц. Дзяйкун, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны дацэнтаў Г. С. Еўдакіменкі, Д. А. Лявончанкі, удзельніка партызанскага руху на тэрыторыі Чэхаславакіі У. В. Анічэнкі. Яны гаварылі аб незабыўных падзеях вайны, успаміналі і свае студэнцкія гады. Прыемна было чуць, што сённяшнія вучоныя-педагогі ў свой час таксама былі студэнтамі-выдатнікамі.

Асабліва хвалюючыя мінуты перажылі правафланговыя гістфіла, калі дэкан факультэта Т. І. Язэпава і сакратар партбюро М. Ф. Гуліцкі ўручалі ім Ганаровыя граматы і кнігі, а член камітэта камсамола ГДУ ленінскі стыпендыят біялагічнага факультэта С. Рыдны — значкі ЦК ВЛКСМ і Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР «За выдатную вучобу».

Адно за другім называліся прозвішчы: сакратар камсамольскай арганізацыі факультэта Анатоль Шэвель, намеснік сакратара па ідэалагічнай рабоце Віктар Лютынскі, старшыня вучэбна-выхаваўчай камісіі Пётр Неўмяржыцкі, старшыня факультэцкага прафбюро Таццяна Стрыжак, член камітэта камсамола, купалаўскі стыпендыят Іван Афанасьеў...

На сустрэчы было трапна зазначана, што выдатнікі — гэта залаты фонд кожнага факультэта. Хочацца, каб ён павялічваўся з кожным годам і разам з ім узрастаў прэстыж нашага універсітэта. Ну, а што датычыцца праведзенай сустрэчы выдатнікаў гістфіла, то яна стане яшчэ адным радком да летапісу лепшых традыцый гэтага факультэта.

**Б. ВАЛОДЗІН.**

*СПРАВЫ ІНТЭРНАТА*

# СТУДСАВЕТ У ПОШУКУ

У бягучым навучальным годзе састаў студэнцкага савета інтэрната № 2 матэматычнага факультэта быў амаль поўнасцю абноўлены. Прайшло першых паўгода яго работы. У сувязі з гэтым хацелася б ацаніць формы і метады дзейнасці студсавета, адзначыць яе моцныя і слабыя бакі.

Бадай, галоўнае, што вызначае сёння работу студсавета — гэта агульная накіраванасць на максімальнае паляпшэнне ўмоў быту студэнтаў, на стварэнне ў інтэрнаце такой абстаноўкі, у якой не было б месца для розных парушэнняў грамадскага парадку, для з'яў, якія супярэчаць самому духу сацыялістычнага агульнажыцця.

У гэтым напрамку студсаветам ужо на працягу некалькіх месяцаў вядзецца мэтанакіраваная работа. Новай, даволі цікавай і плённай, на наш погляд, формай такой работы стаў пастаянны кантакт студсавета інтэрната з групай народнага кантролю матэматычнага факультэта. У выніку іх узаемадзеяння ў сферу дзейнасці факультэцкай групы народнага кантролю ўвайшлі такія пытанні, як вывучэнне ўмоў быту студэнтаў, якія жывуць у інтэрнаце, кантроль за дзейнасцю адміністрацыі, праверка санітарнага стану пакояў, выкананне студэнтамі сваіх абавязкаў у інтэрнаце і інш. Розныя бакі жыцця інтэрната народныя кантралёры факультэта за мінулыя шэсць месяцаў разглядалі чатыры разы. Па выніках праверак складзены акты, у якіх указаны розныя парушэнні, выяўленыя народнымі дазорнымі, а таксама прапанаваны меры па іх ліквідацыі. Па сумесных прапановах студсавета і групы народнага кантролю факультэта прыняты меры, накіраваныя на паляпшэнне санітарных і бытавых умоў у інтэнаце.

Паляпшэнню якасці выхаваўчай работы ў інтэрнаце садзейнічае таксама пастаяннае ўзаемадзеянне студсавета з камсамольскім бюро і з вучэбна-выхаваўчай камісіяй факультэта. Так, ВВК матфака правяла анкетаванне сярод студэнтаў, мэтай якога было: выявіць тыя суб'ектыўныя і аб'ектыўныя прычыны, якія перашкаджаюць у вучобе, негатыўна ўплываюць на працэс фарміравання актыўнай жыццёвай пазіцыі студэнтаў. Вывады, зробленыя пасля аналізу анкет, выкарыстаюць у сваёй практычнай рабоце і камсамольскае бюро факультэта, і студсавет інтэрната.

Палепшылася работа ў інтэрнаце па прававому выхаванню студэнтаў. Як вядома, на працягу апошніх двух гадоў у інтэрнаце № 2 не было сур'ёзных парушэнняў сацыялістычнай законнасці і правіл пражывання ў ім. Аднак вопыт мінулага года, звязаны з упарадкаваннем прапускнога рэжыму ў інтэрнатах універсітэта, паказаў, што і ў нас ёсць яшчэ нямала студэнтаў, якія недастаткова дакладна разумеюць асобныя прававыя нормы вышэйшай школы і палажэнні грамадзянскага права. Таму новы састаў студсавета ўдзяліў пытанням прававога выхавання (і ў першую чаргу — прававой прапагандзе) значную ўвагу. Да гэтай работы праз факультэцкую арганізацыю таварыства «Веды» былі прыцягнуты вопытныя лектары і прапагандысты. Напрыклад, вельмі кваліфікаваным было выступленне ў інтэрнаце выкладчыка юрыдычнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна, члена Саюза журналістаў СССР У. П. Лагойскага. З'яўляючыся ў недалёкім мінулым адказным супрацоўнікам Міністэрства ўнутраных спраў рэспублікі, У. П. Лагойскі часта сутыкаўся ў сваёй практыцы з фактамі злачыннасці ў маладзёжным асяроддзі. Таму яго гутарка «Некаторыя прычыны злачыннасці ў БССР» выклікала павышаную цікавасць студэнцкай аўдыторыі. Лектар на шэрагу канкрэтных фактаў паказаў дынаміку працэсу паступовага падзення асобы, якая стала на шлях правапарушэнняў: ад дробных парушэнняў да сур'ёзных учынкаў, ад іх—да грубых парушэнняў закона і, нарэшце, да цяжкіх злачынстваў. Нельга пераацаніць выхаваўчае значэнне такой гутаркі.

Вялікую работу па прававой прапагандзе ў інтэрнаце № 2 вядуць і ўніверсітэцкія лектары. Па запрашэнню студсавета тут выступалі супрацоўнікі кафедры навуковага камунізму А. Касьяненка і А. Кузьміч. У лекцыі А. Касьяненкі «Палітычная сістэма савецкага грамадства і далейшае развіццё сацыялістычнай дэмакратыі» быў раскрыт механізм ажыццяўлення палітычнай улады ў нашым грамадстве, закрануты пытанні ўдасканалвання савецкага права, разгледжаны тэндэнцыі яго развіцця. Гутарка А. Кузьміча выкрывала буржуазную псеўдадэмакратыю. Прыводзіліся шматлікія даныя, якія пераканаўча паказвалі грубыя парушэнні дэмакратыі ў буржуазным грамадстве, бяспраўе бяднейшых слаёў насельніцтва, зроблены аналіз прычын парушэння канстытуцыйных правоў чалавека ў ЗША, ФРГ, іншых краінах капіталу.

Шмат увагі ўдзяляе пытанням выканання правіл пражывання ў інтэрнаце і прафілактыкі правапарушэнняў сярод студэнтаў і слухачоў падрыхтоўчага аддзялення старшыня прафбюро матфака, дацэнт кафедры тэорыі функцый і функцыянальнага аналізу У. Р. Ермакоў.

Нямала новага, цікавага ў рабоце студсавета з'явілася ў бягучым навучальным годзе. У гэтым — немалая заслуга яго старшыні Алы Кутаевай, членаў студсавета Антаніны Дудзянковай, Мары Кандрацюк і інш. Ёсць, аднак, у гэтай рабоце і свае пралікі, слабыя месцы. Часам актыву інтэрната не хапае камсамольскай прынцыповасці і баявітасці, цвёрдасці і паслядоўнасці ў барацьбе з парушальнікамі правіл унутранага распарадку. Не заўсёды яшчэ члены студсавета, разбіраючы той ці іншы ўчынак, памятаюць, што ад нязначнага парушэння да сур'ёзнага сутыкнення з законам не такая ўжо і вялікая адлегласць. Таму парушальніка трэба своечасова спыніць, каб ён не верыў у сваю беспакаранасць. Барацьба з любымі з'явамі, якія супярэчаць прынцыпам сацыялістычнага агульнажыцця, павінна весціся цвёрда і непрымірыма, як кажуць, «не зважаючы на асобы».

Думаецца, аднак, што ўказаныя недахопы не з'яўляюцца характэрнымі ў рабоце студэнцкага савета. Яны — свайго роду «хвароба росту», станаўлення калектыву студсавета. Хацелася б пажадаць актыву інтэрната і ў далейшай сваёй дзейнасці не спыняцца на дасягнутым, праяўляць у сваёй рабоце больш ініцыятывы і энтузіязму.

**С. БАДРУНОЎ,**
**член партбюро матфака, старшы куратар інтэрната № 2.**

*Да працоўнага семестра—84*

# ПОСПЕХ ЗАБЯСПЕЧВАЕЦЦА СЁННЯ

Не так ужо далёка той час, калі пачнецца трэці працоўны семестр. Як рыхтуюцца да яго студэнты эканамічнага факультэта? Сфарміравана 11 СБА, у асноўным — небудаўнічага напрамку. Тлумачыцца гэта пераважнай большасцю дзяўчат на эканомфаку. Амаль усе атрады будуць працаваць на тэрыторыі Гомельскай вобласці. На будаўніцтве гарадскога ўнівермага будзе праходзіць працоўнае лета ў слухачоў падрыхтоўчага аддзялення, якія потым папоўняць студэнцкую сям'ю эканамічнага факультэта. Як і ў мінулыя гады, многія дзяўчаты апрануць у час трэцяга працоўнага семестра форму праваднік чыгуначных вагонаў, будуць ствараць пасажырам у далёкіх рэйсах максімум утульнасці, зручнасцей.

Аб'ектамі ўдарнай працы байцоў стануць таксама Светлагорскае аб'яднанне «Хімвалакно», саўгасы «Ціхінічы» і «Судкова». Два атрады выедуць за межы вобласці — у г. Віцебск і сонечную Малдавію.

У падрыхтоўчы перыяд такія камандзіры і камісары, як Л. Прусава (СБА «Грэнада»), Л. Кароткая і І. Трусіна (СБА «Юнацтва») добра правялі работу па фарміраванню атрадаў.

Цяпер на факультэце праходзіць вучоба камандзіраў, камісараў і ўсяго атраднага актыву. Ужо праведзена вучоба адказных за ваенна-патрыятычную работу, рэдактараў насценных газет. Праходзіць кампанія па заключэнню дагавораў з прымаючымі арганізацыямі. Чым хутчэй і ясней мы правядзем яе, тым дакладней зможам вызначыць саставы СБА, больш плённай будзе наша работа, на аб'ектах.

Студэнты нашага факультэта, якія летам апрануць будатрадаўскую форму, ясна разумеюць, што добрай арганізацыяй усёй работы ў падрыхтоўчы перыяд яны забяспечваюць будучы поспех.

**Л. БУРАВА,**
**начальнік штаба працоўных спраў**



НА ЗДЫМКУ: за работай аператар ІВЦ Л. Радчанка.

# ДА ЎВАГІ КУРАТАРАЎ І ПАЛІТІНФАРМАТАРАЎ

Паведамляецца прыкладная тэматыка палітычных інфармацый і гутарак сярод студэнтаў у красавіку 1984 г.

### I. ПЫТАННІ ПАЛІТЫЧНАГА ЖЫЦЦЯ

**1. Ленінізм — наш пераможны сцяг і зброя.** (Аб 114-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна).

Матэрыял апублікаван у часопісе «Агитатор» № 6 за 1984 г.

**2. Савецкае грамадства — грамадства сацыяльнай справядлівасці і сапраўднага народаўладдзя.**

Матэрыял публікуе газета «Звязда».

**3. Свята камуністычнай працы.** (Аб патрыятычным імкненні працаўнікоў гарадоў і вёсак ударнай працай, высокай якасцю работы азнаменаваць ленінскі камуністычны суботнік 21 красавіка г. г.).

Матэрыял публікуюць усе газеты.

### II. ПЫТАННІ ЭКАНАМІЧНАГА ЖЫЦЦЯ

**4. Як выконваюцца план і сацыялістычныя абавязацельствы калектыву.** (Прааналізаваць вынікі работы свайго калектыву ў першым квартале г. г., раскрыць наяўныя рэзервы і магчымасці для далейшага павышэння прадукцыйнасці працы і зніжэння сабекошту прадукцыі).

Матэрыял публікуюць газеты «Советская Белоруссия», «Сельская газета».

**6. Укараненню гаспадарчаразліковых асноў — усямерную падтрымку.** (Аб выкарыстанні гаспадарчага разліку для ўзмацнення рэжыму эканоміі і беражлівасці, умацавання планавай і працоўнай дысцыпліны ва ўсіх звеннях вытворчасці).

Матэрыял публікуе газета «Звязда».

**6. Галоўнае — клопаты аб людзях.** (Аб задавальненні попыту насельніцтва на тавары і бытавыя паслугі, аб паляпшэнні якасці работы прадпрыемстваў сферы абслугоўвання).

Матэрыял публікуе газета «Советская Белоруссия».

### III. ПЫТАННІ КУЛЬТУРЫ І КАМУНІСТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ

**7. Каб лепш жыць, трэба лепш працаваць.** (Аб высокім грамадскім абавязку кожнага савецкага чалавека з поўнай аддачай сіл працаваць на даручаным участку, аб бескампраміснай барацьбе з праяўленнямі хцівасці, утрыманства, дармаедства).

Матэрыял публікуе газета «Знамя юности».

### IV. ПЫТАННІ МІЖНАРОДНАГА ЖЫЦЦЯ І ПАЛІТЫЧНАГА ВЫКРЫЦЦЯ ІМПЕРЫЯЛІЗМУ

**8. Берагчы мір, умацоўваць бяспеку нашай Радзімы.** (Аб паслядоўнасці знешнепалітычнага курсу КПСС і Савецкага ўрада на спыненне гонкі ўзбраенняў, прадухіленне пагрозы тэрмаядзернай вайны, развіццё міжнароднага супрацоўніцтва).

Матэрыял публікуе газета «Звязда».

**9. Арсенал палітыкі імперыялізму: дыверсіі, разбой, тэрор.** (Аб грубым парушэнні ЗША і іншымі імперыялістычнымі дзяржавамі міжнароднага права, суверэнітэту іншых дзяржаў, аб беспрэцэдэнтнай па сваіх маштабах і раз'юшанасці псіхалагічнай вайне супраць сацыялізму і прагрэсу).

Матэрыял публікуе газета «Звязда», гл. таксама часопіс «Международная жизнь», № 3 за 1984 г.

*Твой вольны час*

# ЗНАХОДЛІВАСЦЬ І ФАНТАЗІЯ

Вясёлы, захапляючы конкурс «Ану, дзяўчаты!» праведзены ў інтэрнаце № 4 на Валатаве. У ім удзельнічалі каманды эканамічнага факультэта — Т-11 і 0-21. Удзельніцам конкурсу яшчэ загадзя было дадзена дамашняе заданне: падрыхтаваць нумары мастацкай самадзейнасці і «напітак багоў».

У зале — шмат балельшчыкаў. Вядучыя Людміла Шаўцова і Аляксей Лішык прадстаўляюць членаў журы — асістэнта кафедры галіновых эканомік Н. В. Волкаву, сакратара камітэта ЛКСМБ ГДУ А. Кусянкова, сакратара камітэта камсамола В. Жосткіна, члена студсавета інтэрната В. Васюка.

Першы конкурс — прывітанне саперніцам, журы. Дзяўчаты добра справіліся з ім. Потым праводзіліся жартоўныя конкурсы цырульнікаў і «Пляткарка». Сутнасць апошняга заключалася ў наступным: адной з удзельніц каманды чытаецца невялікае гумарыстычнае апавяданне, якое за 15 секунд трэба пераказаць наступнай удзельніцы. Апошняя з каманды павінна скласці апавяданне. Больш знаходлівымі ў гэтым конкурсе аказаліся дзяўчаты групы 0-21.

Самым яркім момантам у конкурсе «Ану, дзяўчаты!» было паднясенне «напітка багоў». У адзенні багіні ў залу ўваходзіць Галіна Аўрамчыкава і нясе цудоўныя напіткі. Шмат фантазіі, выдумкі праявілі ўдзельніцы гэтага конкурсу.

Спачатку лік быў на карысць каманды групы 0-21. Але першакурсніцы «не палі духам» і здолелі дагнаць сваіх саперніц. Членам журы цяжка было вырашыць, каму аддаць перавагу.

А з якім энтузіязмам уключыліся ў барацьбу балельшчыкі! Пад апладысменты залы Н. Кардзіяк, С. Ахраменка і І. Жукоўская выканалі вясёлыя прыпеўкі.

Праведзены ўсе конкурсы, і старшыня журы Н. В. Волкава аб'явіла лік: 35:35. Гучаць воклічы: «Малайцы!». І сапраўды. Колькі яркіх, вясёлых і хвалюючых мінут падарылі дзяўчаты гледачам, балельшчыкам.

Увесь вечар у інтэрнаце панавала веселле, гумар, смех і радасць. Вельмі хочацца, каб гэта добрае пачынанне стала традыцыйным у нашым інтэрнаце тым больш, што ўсе ўмовы для яго правядзення ў нас ёсць.

**Л. ПРУСАВА,**
**член камітэта камсамола эканамічнага факультэта, адказная за жыллёва-бытавы сектар.**

## СПАБОРНІЧАЛІ ШАХМАТЫСТЫ

У інтэрнаце № 4 праведзена першынство па шахматах. У спаборніцтвах прынялі ўдзел 11 студэнтаў. У выніку шматдзённай напружанай барацьбы, а спаборніцтва праводзілася па кругавой сістэме, першае і другое месцы раздзялілі В. Сцефановіч (пакой № 306) і А. Бандарэнка (пакой № 508) з эканамічнага факультэта, якія набралі 10 ачкоў з 11 магчымых. Пераможцы ўзнагароджаны прызамі.

Шахматы — захапляючая гульня, якая развівае разумовыя здольнасці чалавека. Таму пажадана, каб у спаборніцтвах прымала ўдзел як мага больш студэнтаў.

**В. ВАСЮК,**
**студэнт групы Т-31 эканамічнага факультэта.**

СПОРТ

# МАТЧ ДРУЖБЫ

На працягу чатырох дзён у спартыўнай зале ГДУ праходзіла пятае адкрытае першынство Гомельскага аблсавета ДСТ «Буравеснік» па фехтаванню. У ім удзельнічала 6 каманд: БДУ імя У. І. Леніна, БІНГа, Ленінградскага інстытута інжынераў чыгуначнага транспарту, Баку, Бранска і Гомеля.

Увесь турнір прайшоў цікава і напружана. Пераможцамі спаборніцтваў па відах зброі сталі: шабля — М. Фабрыкант (БДУ), рапіра жанчыны — В. Пятруша (ГДУ), рапіра мужчыны — С. Раміяр (Баку), шпага — А. Дагадаў (ГДУ).

Упарты характар насілі камандныя баі. Нашы дзяўчаты сталі пераможцамі сярод рапірыстак. У шпажыстаў мацнейшай аказалася каманда Беларускага інстытута народнай гаспадаркі, у шаблістаў — каманда БДУ, у рапірыстаў — г. Баку.

**В. ЛІСОЎСКІ,**
**майстар спорту СССР, галоўны сакратар спаборніцтваў.**

□

## МАЙСТЭРСТВА ТРЭБА ПАВЫШАЦЬ

У г. Брэсце праведзены чэмпіянат Белсавета ДСТ «Буравеснік» па плаванню. Каманда нашага універсітэта набрала 640 ачкоў і заняла трэцяе месца. Найбольш падрыхтаванымі да гэтых адказных спаборніцтваў аказаліся старшакурснікі факультэта фізвыхавання. Прызёрамі чэмпіянату сталі студэнт чацвёртага курса Уладзімір Манькоў, трэцякурснікі Сяргей Кузікаў, Юрый Шкрыль, Іна Каваленка. Паспяхова выступіла ў плаванні вольным стылем дзесяцікласніца, член СК ГДУ Вольга Вярэмка, якая стала бронзавым прызёрам на трох дыстанцыях.

Хацелася б бачыць у зборнай камандзе плыўцоў ГДУ і студэнта другога курса факультэта фізвыхавання майстра спорту СССР Сяргея Якушава, які за час вучобы ва ўніверсітэце чамусьці прыкметна знізіў свае спартыўныя паказчыкі.

**В. ГІЛЬ,**
**старшы выкладчык кафедры фізвыхавання.**

# ВЯСЁЛАЯ СУБОТА

**1-га красавіка лічыцца днём смеху, у які звычайна з намі адбываюцца самыя неверагодныя смешныя гісторыі, кур'ёзы, розыгрышы. У гэты дзень гучаць жарты, шчыры смех. А яны, як вядома, прыўзнімаюць настрой, хоць на некаторы час пазбаўляюць нас ад будзённасці спраў, вечнай занятасці. Дык смейцеся на здароўе! Няхай дапаможа вам у гэтым і гумарыстычны выпуск «Вясёлай суботы», падрыхтаваны старшым навуковым супрацоўнікам галіновай навукова-даследчай лабараторыі кафедры радыёфізікі Віктарам ЯЦКЕВІЧАМ.**

## АДКРЫТАЯ ЛЕКЦЫЯ

На курсах павышэння кваліфікацыі ў адной са сталічных ВНУ я даведаўся аб зусім новым метадзе выкладання. Сутнасць яго заключаецца ў наступным. У час чытання лекцыі неабходна выбраць у аўдыторыі слухача з самым абыякавым тварам і яўнымі прыкметамі апатыі. Пасля гэтага трэба бесперапынна глядзець на гэтага студэнта і рабіць усё магчымае, каб хоць як-небудзь расшавяліць яго і не даць яму заснуць. Пры гэтым выкладанне матэрыялу неабходна паўтараць да таго часу, пакуль твар гэтага чалавека праясніцца і ў вачах не з'явяцца хоць якія-небудзь праблескі ведаў. Затым рэкамендуецца сканцэнтраваць сваю ўвагу на другога такога ж студэнта і зрабіць тое ж самае. Такім чынам, пераключаючы ўвагу з аднаго лянівага студэнта на другога, вядзецца выкладанне матэрыялу лекцыі.

— Гэты ўльтрасучасны метад выкладання па крытэрыю мінімальнага ўзроўню вельмі эфектыўны, — сказалі мне па сакрэту і, пераходзячы на шэпт, дадалі: — Яго выкарыстоўваюць толькі Нобелеўскія лаўрэаты ў буйных вучэбных цэнтрах Еўропы!

Калі я вярнуўся ва універсітэт, то першым жаданнем было праверыць новы метад, аб якім я, канешне, нікому не расказаў. Для атрымання аб'ектыўнай ацэнкі я арганізаваў адкрытую лекцыю і запрасіў усіх выкладчыкаў нашай кафедры на чале з загадчыкам. Лекцыю я правёў, як мне здалося, бліскуча, у поўнай адпаведнасці з новай методыкай. Пасля лекцыі адбылося пасяджэнне кафедры, дзе ўсе выкладчыкі аднадушна далі высокую ацэнку, адзначылі прафесіянальны ўзровень, прастату і даступнасць выкладання матэрыялу, умелае выкарыстанне наглядных дапаможнікаў. Вынік абмеркавання падвёў загадчык кафедры:

— Малайчына, — сказаў ён. — Адчуваецца, што на курсах часу дарэмна не губляў. Вось толькі хацелася б указаць на адзін недахоп, аб якім ужо гаварылі ўсе выкладчыкі. У час лекцыі вы чамусьці зусім не звярталі ўвагі на студэнтаў, а па чарзе бесперапынна глядзелі на кожнага з нас.

**В. ЯЦКЕВІЧ.**

### АБ'ЯВА

У сувязі з правядзеннем гастролей вакальна - інструментальнага ансамбля «Эй, ухнем!» на цэнтральным стадыёне, спорткамітэт вырашыў правесці гарадскія легкаатлетычныя спаборніцтвы на сцэне абласной філармоніі.

### ПОСПЕХ СПАРТСМЕНА

На праходзіўшых міжнародных спаборніцтвах па боксу выдатныя ачкі зарабіў наш спартсмен цяжкай вагі Малатабойцаў. Аправа рагавая, сцёклы дымчатыя.

### ПОСПЕХІ АСПІРАНТА

У выніку шматгадовых даследаванняў аспірант-матэматык Лабанок устанавіў, што ў яго нявесты адносіны даўжыні акружнасці таліі да дыяметра роўныя ліку «пі». Пошукі маладога вучонага працягваюцца.

### ВЫПАДАК НА КАФЕДРЫ

На чарговае пасяджэнне кафедры электрафізікі асістэнт Токаў прыйшоў са спазненнем.

— Што гэта ў вас? Кандыдацкая? — спытаў загадчык кафедры, паказваючы на тугa набіты партфель асістэнта, які на працягу пятнаццаці гадоў паспяхова працаваў над дысертацыяй.

— Не, — з гонарам адказаў асістэнт. — Доктарская! Па два дваццаць за кілаграм.

### ПАРАДЫ ВЫКЛАДЧЫКАМ

Калі на экзамене вы паставілі ў заліковую кніжку адзнаку «хор.» або «удов.», а студэнт не задаволены і лічыць, што заслугоўвае большага, рэкамендуецца дапісаць у залікоўку адзнаку поўнасцю, напрыклад: «хорошо» або «удовлетворительно».

### БІЯЛАГІ ПРАПАНУЮЦЬ

Вучонымі біялагічнага факультэта распрацаваны новы рэцэпт прыгатавання чаю. Яго адметная асаблівасць у тым, што замест дэфіцытнага чайнага ліста для заваркі выкарыстоўваецца лісце свежай або квашанай капусты. Новы напітак рэкамендуецца заварваць не ў чайніку, як звычайна, а ў гліняным гаршку або каструлі. Для смаку раяць дабаўляць дробна накрышаную бульбу.

Рэдактар Ул. БАЛОГА.

**Дэканат і прафбюро фізічнага факультэта, кафедра агульнай фізікі глыбока смуткуюць з выпадку заўчаснай смерці старшай лабаранткі гэтай кафедры СІМАНАВАЙ Людмілы Давыдаўны і выказваюць сваё спачуванне сям'і памёршай.**

**Дэканат і прафбюро фізічнага факультэта, кафедра фізічнай метралогіі выказваюць глыбокае спачуванне старшаму навуковаму супрацоўніку гэтай кафедры САЛДАТАВУ Віктару Паўлавічу з выпадку напаткаўшага яго гора — смерці МАЦІ.**

«Гомельский университет» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ и профкомов Гомельского государственного университета (на белорусском языке), Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 1 друк аркуш. Тыраж 2000 экз.
Наш адрас: вул. Савецкая, 104, п. 3-11, т. 56-16-52.

АЗ 41190

Зак. 1284